## ДОБРЫМ БУДЗЬ! І ЧУЛЫМ БУДЗЬ!

*(Генадзь Пашкоў)*



— Прывітанне, Васілінка! Што ты будзеш рабіць у выхадныя?

— Мы з мамай і татам пойдзем у прытулак для жывёл.

— Навошта, у вас жа ёсць сабачка?!

Якая размова, на вашу думку, магла адбыцца далей?

Уладку́ецца — зручна размесціцца.
Сумле́нне — *рус.*: совесть.

Прачытайце назву твора, разгледзьце малюнак. Каго можна назваць безбілетнай падарожніцай?

## Безбілетная падарожніца

*Артур Вольскі*

Жульцы неаднойчы даводзілася ездзіць з намі ў тралейбусе. Мы часам бралі яе з сабой на работу. Нават у госці. У дарозе яна заўсёды вельмі хвалявалася. Доўга не магла ўседзець на адным месцы. То мне на рукі ўскочыць, то да гаспадыні перабяжыць, то ў Сярожы на каленях уладкуецца.

Аднаго разу кантралёр, правяраючы білеты, пажартаваў:

— Безбілетніца! Таму і баіцца, каб не высадзілі, хвалюецца...

Неяк раніцай я пайшоў у магазін па хлеб. І Жулька за мной увязалася. Перайшлі на другі бок вуліцы. А тут якраз тралейбусны прыпынак. І тралейбус падыходзіць. І дзверы адчыняюцца. Не паспеў я і вокам міргнуць, а Жулька — ужо ў тралейбусе. Пабег

я за ёй, але дзверы перад самым маім носам зачыніліся. І тралейбус рушыў далей.

Кінуўся я спачатку ўслед. Ды дзе там! Хіба дагоніш...

Ну, думаю, усё. Бывай, Жулька!.. Як я зараз дадому вярнуся? Што скажу?

Сумна мне стала. І горка. Нават пра хлеб забыўся. Без пэўнай мэты брыду сабе па вуліцы да наступнага прыпынку. Для ачысткі сумлення. Аж бачу — ляціць мне насустрач белы пуховы камяк і вішчыць на ўсю вуліцу Жульчыным голасам.

Яна! Жулька!



А тая з радасці як скочыць з ходу мне проста на грудзі. І лізь сваім гарачым ружовым языччком проста ў нос. Падхапіў я яе на рукі, прыцісную ў да шчакі.

Ідуць людзі. Глядзяць на нас. Дзі́вяцца. Ну і няхай сабе!

А хлеба ў той дзень мы так і не прыне́слі.

1. Як адносіўся да Жулькі гаспадар? Як выражала свае адносіны да яго Жулька?
2. Прачытайце, як перажываў гаспадар, калі Жулька апынулася ў тралейбусе.
3. Як павяла сябе Жулька, калі ўбачыла гаспадара? Пра што гэта гаворыць?
4. Чаму дзівіліся людзі, гледзячы на гаспадара і сабаку?
5. Прачытайце твор выразна.
6. Падумайце, чаму так гавораць: «Сабака — сябар чалавека».

Якую жывёлу вы б хацелі мець? Раскажыце, як вы яе назавяце, як будзеце даглядаць. Што спатрэбіцца для яе догляду?

Прачытайце верш. Замест малюнкаў называйце патрэбныя словы. Падумайце, на якую тэму гэты верш.

## Грыбы

*Артур Вольскі*

З моху выгнуўся гарбок.  
А пад ім сядзіць  .

Гэй, грыбок баравы!  
Не хавай галавы.  
Паблукаю па бару —  
усе грыбочкі пабяру!

А  :  
— Цінь-цінь,  
і для іншых  
кінь-кінь!

Будзе ўсю зіму   
без грыбочкаў плакаць горка.

Слёзы — градам з вачанят:
— Чым карміць ваверчанят?!

Я схаваў адразу ножык.

У мяне — паўнюткі  .

Лепш парадую вавёрку
і грыбоў пакіну горку
на пянёчку ля сасны,
каб хапіла да вясны...

Эх, і смачныя грыбочкі —
проста з лесу, а не з бочкі!

1. Як вы лічыце, гэты твор пра грыбы, пра вавёрчыну сям'ю ці пра беражлівыя адносіны да лясных багаццяў? Растлумачце сваю думку.
2. Як гэты твор характарызуе аўтара?
3. Пра што трэба памятаць, калі збіраеш лясныя дары?
4. Назавіце ў вершы словы, якія рыфмуюцца. Прыдумайце такія словы самі.

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЧЫТАНАЕ

**1.** Назавіце персанажаў. З якіх яны твораў? Хто аўтары гэтых твораў? Чым вам запомніліся гэтыя персанажы? Дайце ім характарыстыку.



**2.** Назавіце творы, прысвечаныя: 1) ахове птушак, 2) ахове раслін, 3) клопату пра свойскіх і дзікіх жывёл. Хто аўтар гэтых твораў?

**3.** Узнавіце вершаваныя радкі. З якіх яны твораў? Назавіце аўтараў гэтых твораў.

1) «Я прашу вас, ...,
Ландыш не губіце,
... на свеце
Вечна беражыце».

2) «Эх, і ... грыбочкі —
проста з лесу, а не з ...!»

3) «І ... словы ў сэрцах дзяцей
Ласка́выя струны кранулі,
І ... дзеці — пры́клад для людзей! —
Сініцы ... вярнулі».

**4.** Прачытайце спалучэнні слоў. З якіх яны твораў? Назавіце аўтараў. Якія з гэтых твораў вас найбольш уразіў? Чым?

1) Суровая зіма → высокія гурбы → бярозавыя венікі = ...

2) Прыгожы парк → векавыя ліпы → шпачыная сям'я = ...

3) Чырвоныя кропелькі → маміны пацеркі → божыя кароўкі = …

4) Тралейбусны прыпынак → белы пуховы камяк → ружовы язычок = …

**5.** Прыдумайце і раскажыце па малюнках казку «Падарожжа пластыкавай бутэлькі».

